зяйственные связи эффективно, надежно, с меньшими затратами общественного труда.

УДК 65.9(2)

У.А.Кулажанка, прафесар

## САЦЫЯЛЬНЫЯ І УЗНАЎЛЕНЧЫЯ АСПЕКТЫ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ

The problems of wages ave considered. In the first place it is considered as a social category on the base of wnich the expenditure of manpowen is compensated. In the second place as a reproduction category and simple and enlarged reproductic ns depend on it.

Сярод актуальных, супярэчлівых, складаных і сацыяльна важных эканамічных формаў ці сістэмаў зарплата займае, бадай, адно з першых месц. Супярэчнасць яе ў тым, што, з аднаго боку, яна сацыяльная катэгорыя, бо на яе аснове ажыццяўляецца замяшчэнне выдаткаў рабочай сілы, а з другога - узнаўлен катэгорыя, паколькі ад яе ўзроўню залежаць магчымасці любой фірмы аж цяўляць простае, звужанае ці расшыранае ўзнаўленне.

Разважанні некаторых эканамістаў наконт таго, што у сучасных умовах, калі сталі занадта дарагімі сыравіна і энергія, зар ботная плата у выдатках вытворчасці займае нязначную вагу - ад 3 да 8 працэнтаў, - грунтуюцца на павярхоўным поглядзе на гэтую катэгорыю. Па-першае, трэба ўлічваць, што у працэсе вытворчасці ўдзельнічае жывая праца і арэчаўленая праца (заўважце, праца), праца ўчарашняя і сённяшняя, чкая мае не толькі канкрэтную форму, але і вартасную ацэнку. А па-другое, ВНП па вартасці складаецца з сумы заработных плат і амартызацыі асноўных фондаў ці капіталу. Смешна даводзіць, што на цану, напрыклад, хлеба мала ўплываюць памеры заработнай платы хлебапёкаў. Чаму? Таму што цана хлеба, як, між іншым, і любога тавару, залежыць не толькі ад бягучых, апошніх, але і ад папярэдніх выдаткаў на аплату працы сялян, якія вырасцілі збожжа, затым рабочых зернясховішчаў, дзе зерне даведзена да пэўнай кандыцыі па вільгаці і чысціні, рабочых млыноў, дзе зерне стала мукой, рабочых пякарняў, дзе мука стала хлебам, і, нарэшце, гандлёвых работнікаў, дзе хлеб-тавар стаў хлебам-прадуктам і пайшоў на спажыванне. Атрымліваецца, што цана хлеба ёсць сума заработнай платы (зноў жа заработнай платы), якую атрымліваюць людзі, занятыя карыснай (і надзвычай неабходнай) працай у так званай невытворчай сферы.

Са сказанага вынікае, што заработная плата па сваёй сутнасці ёсць неабходны прадукт працуючых, дзе б і на якім бы этапе тэхналагічнага працэсу яны ні былі занятыя. У гэтым яе сацыяльны бок. А па сваім змесце яна, калі браць асобны этап тэхналагічнага працэсу, ёсць частка выдаткаў грамадскага працэсу

вытворчасці, а калі ахапіць увесь працэс вытворчасці, то яна ёсць вартасць канчатковага прадукту. У гэтым яе ўзнаўленчы аспект.

## СУПЯРЭЧНАСЦІ САЦЫЯЛЬНАГА І ЎЗНАЎЛЕНЧАГА БАКОЎ ЗАРПЛАТЫ

Усе спрэчкі і супярэчнасці, якія ёсць у грамадстве ў сувязі з узроўнем заработнай платы, з'яўляюцца супярэчнасцямі паміж сацыяльным і ўзнаўленчым бакамі гэтай катэгорыі. Прафсаюзы, вытворчыя калектывы, асобныя працаўнікі імкнуцца павялічыць заработную плату да ўзроўню поўнага пакрыцця выдаткаў на рабочую сілу. І калі сёння сярэдняя заработная плата ў прамысловасці краіны сягае за 800 тысяч рублёў, то гэта ёсць менавіта вынік азнач нага імкнення. З другога боку, прадпрыемствы і дзяржава, паколькі яна выступае суб'ектам адносінаў вытворчасці як уласнік,імкнуцца скараціць выдаткі на заработную плату з мэтай забеспячэння неабходнага ўзроўню ўзнаўленчага працэсу ў грамадскай вытворчасці.

Добра, каб дзве азначаныя тэндэнцыі знаходзіліся ў раўнавазе. Наша сённяшняя сітуацыя сведчыць аб тым, што гэтай раўнавагі як вызначальнай умовы эканамічнага развіцця няма. Да апошняга павышэння мінімальнай зарплаты пераважаў сацыяльны бок (у якой меры - гэта пытанне асобнае). А цяпер пераважае ўзнаўленчая тэндэнцыя, бо заработная плата замарожана. Раўнавага, такім чынам, як і ў першым выпадку, парушана, што небяспечна. Чаму? Таму што ўзнаўленчы аспект заработнай платы аніяк не павінен супярэчыць сацыяльнаму, калі эканомія на заработнай плаце скарыстоўваецца для накаплення інвестыцый як умоў павышэння заработнай платы ў будучым. Сёння гэтага няма, бо грамадская вытворчасць скарачаецца, і тут ніякае замарожванне заработнай платы не можа пазітыўна ўздзейнічаць на ўзнаўленчы працэс. Больш таго, сённяшняе замарожванне заработнай платы нават супрацьстаіць узнаўленчаму працэсу, бо стрымлівае рэалізацыю выпрацаванай прадукцыі. Прадукцыю трэба не толькі вырабіць, але і даць людзям грошы, каб яны яе купілі. З гэтага вынікае, што заработная плата ў яе сацыяльным значэнні велічыня дадзеная, аб'ектыўная. Ці можам мы сёння сказаць,што заработная плата ў нас аптымальная з пункту гледжання стварэння ўмоваў для нармальнага ўзнаўленчага працэсу? На жаль, не. З гэтага трэба рабіць высновы. І не заўтра, а сёння, неадкладна.

## ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА І ІНФЛЯЦЫЯ

Заработная плата можа выконваць свае сацыяльную і вытворчую (узнаўленчую) функцыі ў тым выпадку, калі яе памеры ў імкненні да аптымальнасці будуць пэўна рэагаваць на інфляцыю, якая, праўда, апошнім часам панізілася, ды з парадку дня яшчэ не знята. Калі гавораць аб індэксацыі заработнай платы, то часам не звяртаюць увагу на тое, што фактычна індэксуецца. На самой

справе, вартасць тавараў, якая ствараецца жывой працай пры дадзеным узроўні прадукцыйнасці працы, велічыня пэўная. Гэта неабходны прадукт. Яго цана павышаецца не сама па сабе, а калі павысіўся кошт арэчаўленай працы і на гэтай аснове мусіла змяніцца цана выробленага прадукту як тавару. Тавар павінен быць прададзены, інакш парушаецца ўзнаўленчы працэс. Таму да неабходнага прадукту трэба дадаць тую частку цаны, якая адлюстроўвае павышэнне кошту сыравіны, амартызацыі, энергіі і г.д. Небяспекі ні для сацыяльнай функцыі заработнай платы, ні для ўзнаўленчай тут няма. Трэба толькі правільна разумець гэта і адпаведна дзейнічаць. Вопыт такіх дзеянняў ёсць. Напрыклад, падчас энергетычнага крызісу на Захадзе фірмы адразу ўключылі высокія цэны на паліва ў выдаткі. Цэны пайшлі ўверх. Фірмы павысілі заработную плату, каб яе атрымальнікі маглі купіць столькі ж тавараў, як і пры ранейшай цане. І ўся праблема. Іншая справа, калі заработная плата адстае ад інфляцыі. Тады прадпрыемствы і дзяржава маюць інфляцыйны даход. Апошнія тры гады ўрад Рэспублікі Белар[illegible] увесь час выкарыстоўваў гэта. А нядаўна Віктар Чарнамырдзін заявіў у Дзяржаўнай Думе, што прыбытковая частка дзяржаўнага бюджэту Расіі за першае паўгоддзе 1995 года нечакана перавыканана за кошт іфляцыйнага даходу. Як бачым, інфляцыя можа быць выгаднай для дзяржавы. Нязначная інфляцыя нават стымулюе прадпрымальніцкую дзейнасць. Гэта неабходна ўлічваць пры рэгуляванні заработнай платы.

## УЗРОВЕНЬ ЗАРПЛАТЫ І ЛЬГОТЫ

Нізкі ўзровень заработнай платы спарадзіў льготы. Тут таксама закрануты сацыяльны і ўзнаўленчы аспекты заработнай платы. Сацыяльны таму, што ў нашай краіне не болей 20 працэнтаў нацыянальнага даходу ішло на зарплату, у той час як у развітых краінах да 65 працэнтаў пры значна большым агульным аб'ёме вытворчасці. Мізэрную заработную плату давялося дапаўняць усемагчымымі даплатамі, якія назвалі льготамі. Ільготы шматлікія таму, што зарплата была і ёсць для большасці працуючых недастатковай для больш-менш нармальнага жыцця. Выклікае здзіўленне, што пастаўлена пытанне аб адмене льготаў. Так, іх трэба ліквідаваць. Але пры абавязковай кампенсацыі праз рост намінальнай і рэальнай заработнай платы. Інакш губляецца сацыяльная функцыя заработнай платы.

Але ці выйграе ўзнаўленчая функцыя ад адмены даплат-ільготаў? Не, бо заработная плата згубіць сваю стымулюючую ролю.

## ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА І ПЕНСІІ

Усе пенсіянеры і працуючыя ведаюць, што пенсійнага фонду ў нас няма. Усё, што было, даўно "з'едзена" цэнтральным дзяржаўным апаратам былога СССР яшчэ да яго развалу. І сітуацыя зараз такая, што пенсіі выплачваюцца [illegible]

прынцыпе "грошы-сёння". На фонд заработнай платы робяцца налічэнні ў памеры 35 працэнтаў і пералічваюцца ў фонд сацыяльнай абароны. Усё для нас звыкла. Але гэта мае адмоўны ўплыў як на сацыяльную, так і ўзнаўленчую функцыі заработнай платы. Па-першае, працуючыя мусяць утрымліваць пенсіянераў, якія стваралі НД і ВНП дзесяць ці дваццаць год таму. Створаная імі вартасць знікла, і зараз яны ўтрымліваюцца коштам сённяшняй працы працуючых. У той час, як працуючыя рабочыя і сяляне павінны праз адлічэнні ствараць фонд свайго ўтрымання ў будучым, яны мусяць аддаваць яго сённяшнім пенсіянерам, прадукт працы якіх даўно спажыты. А ўтрымліваць даводзіцца 2,5 млн. чалавек: на двух працуючых - адзін пенсіянер. Такое ўтрыманне змяншае заработную плату і абумоўлівае павышэнне цэнаў звыш усялякіх межаў. Не лягчэй ад гэтага і пенсіянерам. Яны атрымліваюць пенсіі з перабоямі, бо скарачаюцца адлічэнні ў сацыяльны фонд, і гэтыя адлічэнні не з'яўляюцца падчас крызісу рэгулярнымі. Да таго ж набываць тавары і прадукты пенсіянеры могуць па высокіх цэнах, якія ў значнай меры абумоўлены ўтварэннем пенсійнага фонду па прынцыпе "грошы-сёння".

Узаемадзеянне заработнай платы і "гарачага" пенсійнага забеспячэння абмяжоўвае і ўзнаўленчую функцыю заработнай платы. Менавіта тым, што, з аднаго боку, узнікае моцная і нават непераадольная перашкода для павышэння заработнай платы да ўзроўню яе стымулюючага вытворчасць значэння. А з другога - заработная плата і фонд утрымання непрацуючых, разам узятыя, ствараюць такі памер неабходнага грамадскага прадукту, які настолькі змяншае прыбытак і абмяжоўвае збыт прадукцыі на канкурэнтным рынку, што ўсё цяжэй будзе ствараць фонд накаплення і ажыццяўляць інвестыцыі. А без інвестыцый, прытым пастаянных, няма пашыранага ўзнаўлення, а без апошняга - будучыні ў нацыі.

Дзе выйсце са становішча? Складаная сітуацыя не мае простага вырашэння. Гэта тэма асобнага абмеркавання. Коратка можна толькі сказаць, што на парадак дня вельмі хутка будзе пастаўлена пытанне аб стварэнні дзяржаўнага, рэгіянальных і нават вытворча-калектыўных пенсійных фондаў накшталт камерцыйнага. Толькі такія пенсійныя фонды, якія будуць мець інвестыцыйнае значэнне і самаўзрастаць, могуць стабілізаваць пенсійнае забеспячэнне і, між іншым, вытворчую і сацыяльную функцыі заработнай платы.

## ЗАРПЛАТА І ПАДАТКААБКЛАДАННЕ

Яшчэ не было такога выпадку, каб працоўныя калектывы выступілі супраць непамернага падаткаабкладання сваіх прадпрыемстваў. Між тым, частка падаткаў (не мае значэння, якую назву яны маюць) непасрэдна ўваходзіць у сабекошт і тым самым абмяжоўвае рост той часткі вартасці, якая ідзе на заработную плату. Сацыяльная функцыя заработнай платы церпіць затым зноў на стадыі

пераразмеркавання нацыянальнага даходу, калі праз высокія цэны частка зноў створанай вартасці сплывае з кішэняў працоўных. Непамерныя падаткі паралізуюць таксама ўзнаўленчы працэс не толькі тым, што пакідаюць прадпрыемствы без сродкаў для інвестыцый.

У краіне пачаўся рух за перагляд практыкі падаткаабкладання. Створаны спецыяльны камітэт. Гэта нездарма. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка таксама выказваўся адносна неабходнасці зніжэння падаткаабкладання. Аднак выказаў думку, што падаткаабкладанне павінна забяспечыць патрэбы бюджэтнай сферы. Значыць, падаткі маюць пераважна фіскальны характар: толькі каб узяць. Узровень падаткаў, на жаль, не вызначаецца патрэбамі развіцця вытворчасці, каб для бюджэту можна было заўтра мець болей. Гэта тупіковая сітуацыя. Дзе выйсце? Калі прыняць пад увагу англійскі вопыт, дзе асноўны падаткаплацельшчык - насельніцтва, то трэба так павысіць заработную плату, каб пераважна рабочыя і служачыя фарміравалі бюджэт, а прыбытак прадпрыемства абкладваўся падаткамі ў меншай меры, бо ён павінен стаць надзейнай крыніцай расшыранага ўзнаўлення.

Ва ўсякім выпадку зразумела, што без упарадкавання падаткаабкладання няма надзеі на ўдасканаленне заработнай платы.

## РЭЗЮМЕ

1. На якім бы ўзроўні ні вырашаліся праблемы заработнай платы, неабходна ўлічваць яе як сацыяльную, так і ўзнаўленчую функцыі, дасягаць іх раўнавагавага стану. Падрываць сацыяльную функцыю ці праз яе шкодзіць узнаўленчай функцыі - недапушчальна.

2. Інфляцыя можа ўплываць на заработную плату, але не можа яе змяняць, бо выдаткі працы застаюцца нязменнымі пры любой зменлівай цане. Фактычна індэксуецца не праца, а больш кошт іншых фактараў вытворчасці. Калі парушаецца гэты прынцып, то прадпрыемствы і дзяржава прысвойваюць за кошт працоўных інфляцыйны даход. Што гэта так, сведчыць пусты бюджэт Рэспублікі Беларусь. Была інфляцыя - у бюджэт паступалі грошы, зменшылі інфляцыю - апусцела казна.

3. Ільготы - гэта частка заработнай платы ці іншых асноўных даходаў. Яны выкліканы нізкай заработнай платай. Ліквідаваць ільготы можна і трэба, але пры ўмове павышэння заработнай платы. Інакш будуць парушаны з вялікай шкодай для вытворчасці яе асноўныя функцыі. Казна ад гэтага не папоўніцца.

4. Усё ў большую супярэчнасць паміж сабой уступаюць заработная плата і пенсійнае забеспячэнне. І гэтая супярэчнасць непераадольная. Яна будзе нарастаць і можа быць вырашана праз 15-25 год шляхам стварэння незалежных пенсійных фондаў накшталт камерцыйнага, у тым ліку і дзяржаўнага.

5. Паколькі заработная плата і падаткаабкладанне - складальнікі размеркавальных адносін, то ўпарадкаванне заработнай платы немагчыма без глыбокай падатковай рэформы.

УДК 630.906

А.В.Лихачева, аспирант

# ОСОБО ОХРАНЯЕМЫЕ ТЕРРИТОРИИ В СИСТЕМЕ ПРИРОДОПОЛЬЗОВАНИЯ БЕЛАРУСИ

The character of the system of conservations of the Republik of Belarus is given in this article. The methodological principles of estimation separation and functioning of conservations were stated. The theoretical basis of defining the ecologo-economic efficiency of conservations and their functioning was suggested.

В условиях экономической и политической нестабильности, незавершенности системы правового обеспечения в области охраны окружающей среды, резкого ухудшения экологической обстановки во многих регионах существенно возрастает роль особо охраняемых природных территорий (ООПТ) в поддержании экологического равновесия и охране природного потенциала территорий республики.

В Республике Беларусь имеется 3 государственных заповедника, национальный парк, 152 памятника природы и 70 государственных заказников. Общая площадь территорий 1053,1 тыс.га. Площадь ООПТ составляет 5,1% территории республики [1].

Несмотря на сравнительно хорошо развитую сеть ООПТ РБ, существующие природоохранные объекты пространственно размещены неравномерно, что не отражает весь спектр разносторонних ландшафтов различных геоботанических подзон РБ.

По мнению ученых и специалистов, все охраняемые объекты и территории должны быть объединены в единую систему. В этой системе их надо соединить между собой природно-миграционными коридорами, водоохранными зонами вдоль рек и озер, санитарно-охранными зонами вокруг крупных городов.

Создание и развитие сети ООПТ в дальнейшем будет происходить в рамках Схемы рационального размещения ООПТ РБ [2]. На наш взгляд, эту схему необходимо разрабатывать на основании анализа экологической ситуации в республике и она должна предполагать создание сети оптимального соотношения природных экосистем и антропогенных участков, которая позволит поддерживать целесообразное экологическое равновесие.

Природные охраняемые территории необходимо рассматривать в системе природопользования, которая включает две самостоятельные, но между со-